Цана 10 кап. (грош.)

Пролетары ўсіх краін, еднайцеся!

Орган Часовага Упраўлення гор. Вільно

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

№ 9
2 кастрычніка 1939 г.
панядзелак

Квітнее народнае мастацтва, сагрэтае праменнямі Сталінскай Канстытуцыі

Вялікі і магутны Совецкі Саюз— бацькаўшчына працоўных усяго свету. Яго свабодны народ, навекі вызвалены ад эксплаатацыі памешчыкаў і капіталістаў, дабіўся грандыёзных перамог на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Велізарныя перамогі гэтыя залатымі літарамі запісаны ў Вялікай Сталінскай Канстытуцыі — хартыі свабоднага і шчаслівага совецкага народа.

У сузор'і адзінаццаці брацкіх рэспублік, роўная сярод роўных, цвіце і мацнее Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка. Беларускі народ, вякамі стагнаўшы пад ярмом польскіх памешчыкаў і царскіх сатрапаў, у рэзультаце Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі, пры брацкай дапамозе вялікага рускага народа, упершыню атрымаў сваю дзяржаўнасць, пабудаваў для сябе радаснае і шчаслівае жыццё.

Беларуская ССР, у мінулым адсталая, цёмная, непісьменная акраіна, ператварылася ў квітнеючую індустрыяльна-калгасную рэспубліку. Побач з буйнейшымі перамогамі, атрыманымі беларускім народам у галіне прамысловасці і сельскай гаспадаркі, бліскучых поспехаў дабіўся ён і на фронце культуры — нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу. Свабодны народ квітнеючай рэспублікі стварыў сваё ўласнае мастацтва, вартае соцыялістычнай эпохі.

У Беларускай ССР налічваецца 12 тэатраў. сярод іх гордасць беларускага народа — Дзяржаўны тэатр оперы і балета, паставіўшы на сцэне такія выдатныя беларускія оперы, як „Міхась Падгорны" і „Дрыгва", поўныя багацця народнай беларускай музыкі. На тэрыторыі рэспублікі апрача таго, створаны соўгасна-калгасныя тэатры, якія заслужана карыстаюцца ў гледача вялікай папулярнасцю і любоўю народнай. У гэтых тэатрах сотні працоўных развіваюць і ўдасканальваюць свае таланты.

Шырока развіта народная самадзейнасць. Не так даўно на Ўсесаюзнай сельска-гаспадарчай выстаўцы — на ўсенародным аглядзе перамог калгаснага ладу — з вялікім поспехам, атрымаўшы высокую ацэнку, выступалі прадстаўнікі мастацкай самадзейнасці самых аддалёных раёнаў БССР.

Самадзейнае мастацтва ў Беларускай ССР заваявала пачотнае права і шырокі размах. Яго стварыў сам народ, пяшчотна сагрэты праменнямі Сталінскай Канстытуцыі.

Такія таланты ў нязлічонай колькасці могуць нараджацца і квітнець толькі ў краіне соцыялізма. Совецкая краіна — невычарпальная крыніца народных талантаў.

Веліч мастацтва шчаслівага народа працоўныя гор. Вільно адчувалі ў асобе ўдзельнікаў ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі Беларускай Асобай Ваеннай Акругі ў асобе ўдзельнікоў ансамбля народнай песні і танцаў Саюза ССР.

Выказваючы сваё ўражанне аб канцэрце ансамбля народнай песні і танцаў Саюза ССР, рабочы пекар тов. Мэераў, ад усей душы, выказаў пачуцці ўсіх працоўных:

— Гэты канцэрт я запомню на ўсё жыццё Я ніколі не бачыў такой прыгожасці і можа быць ніколі-б не ўбачыў, калі-б не наша вызваліцельніца, магутная Чырвоная Армія.

Выступленне ансамбляў свабоднага народа краіны соцыялізма на сцэнах тэатраў гор. Вільно — гэта сапраўды ўсенародная ўрачыстасць.

Але тое, што ўбачылі працоўныя гор. Вільно,—назаўсёды вызваленыя ад панскага гнёту, — з'яўляецца ўсяго толькі крупіцай таго, чым багат Совецкі народ.

Совецкі народ працягнуў руку брацкай дапамогі працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Гераічная Чырвоная Армія вызваліла сваіх аднакроўных братоў ад панскай няволі, голада і выміраньня. На сваіх чырвоных знамёнах яна прынесла ім свабоду, радасць і шчасце, магчымасць будаваць для сябе жыццё без паноў і памешчыкаў, такое жыццё, якім жывуць яго браты—народы Совецкай Краіны.

У дружнай сям'і совецкага народа—багатыра, які жыве радасна і шчасліва, сагрэты залатымі праменнямі Сталінскай Канстытуцыі, працоўныя Заходняй Беларусі адкрыюць крыніцу схаваных у ёй талантаў і створаць сапраўды народнае мастацтва, роўнае мастацтву Краіны соцыялізма.

Абед у Старшыні Соўнаркома Саюза ССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В. М. Молатава ў чэсць Міністра Замежных Спраў Эстоніі п. К. Сельтэр

29 верасня гэтага года Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Народны Камісар Замежных Спраў таварыш В. М. Молатаў даў абед у чэсць Міністра Замежных Спраў Эстоніі п. К. Сельтэр. На абедзе прысутнічалі суправаджаючыя п. Міністра Старшыня Дзяржаўнай Думы прафесар п. Ю. Улуотс, прафесар п. А. Пійп, і п. Кана. З састава Эстонскай Місіі ўМаскве прысутнічалі: пасланнік п. Рэй, п. Оянсон, м-м Оянсон, п. Сінка, м-м Сінка, п. Саукас, п. Мальберг, м-м Мальберг.

Акрамя ўпамянутых асоб прысутнічалі т. т. І. В. Сталін, К. Е. Варашылаў, А. І. Мікаян, А. Ф. Горкін, В. П. Пацёмкін, В. Г. Дэканозаў, С. А. Лазоўскі, К. А. Мерэцкоў, К. Н. Нікіцін, П. Е. Красноў, Р. П. Хмельніцкі, С. П. Козырэў, В. Н. Баркоў, А. П. Васюкоў, Л. М. Куропцеў, А. А. Собалеў.

У часе абеда тав. В. М. Молатаў і п. К. Сельтэр абмяняліся прывітальнымі прамовамі. Абед прайшоў у ажыўлёнай і прыязнай атмасферы.

—:::—

Прыём міністра замежных спраў Турцыі п. Сараджоглу таварышам Молатавым.

1 кастрычніка адбылася гутарка таварыша Молатава з міністрам замежных спраў Турцыі п. Сараджоглу па актуальных пытаннях совецка-турецкіх узаемаадносін. У гутарцы прынялі ўдзел таварышы: Сталін,Пацёмкін, Дэканозаў і паўпрэд СССР у Турцыі таварыш Тэрэнцьеў, а з боку Турцыі — турэцк. пасол у СССР п. Актай. Гутарка прадаўжалася больш 4 гадзіні (ТАСС)

—:::—

Ад'езд з Масквы міністра замежных спраў Эстоніі п. К. Сельтэр

30 верасня гэтага года з Масквы вылецеў Міністр замежных спраў Эстоніі п. К. Сэльтер у суправаджэнні Старшыні Дзяржаўнай Думы прафесара Улуотс і прафесара Т. А. Пійп.

Цэнтральны аэрапорт быў упрыгожан совецкімі і эстонскімі флагамі. Для провадаў міністра быў выстаўлен пачотны караул.

(ТАСС).

—:::—

Турэцкі друк аб палітыцы Совецкага Саюза

АНКАРА, 30 верасня. (ТАСС). Журналіст Юнус Надзі піша: «У рэзультаце палітыкі СССР балканскія краіны знаходзяцца ў баку ад вайны. Зараз на Балканах да такой ступені спакойна, што хочацца сказаць, што СССР сваей палітыкай аказаў самую эфектыўную паслугу свету. Гэта СССР забяспечыў давер'е і спакойства на Балканах. Пры цяперашнім становішчы Совецкі Саюз іграе велізарную роль у раўнавазе сіл у Еўропе».

На гарадскім сходзе рабочых троек

30 верасня ў гарадскім тэатры адбыўся сход рабочых троек, выбраных на фабрыках і заводах у дапамогу Часоваму Упраўленню гор. Вільно. На сходзе прысутнічала звыш тысячы чалавек членаў рабочых троек і запрошаных рабочых і работніц прадпрыемств, служачых, прадстаўнікаў інтэлігенцыі і культурна-асьветных работнікаў.

З дакладам аб чарговых задачах рабочых троек выступіў старшыня Часовага Упраўлення г. Вільно таварыш Жылянін. Пры ўпамінанні дакладчыкам вызваліцельніцы працоўных Заходняй Беларусі Чырвонай Арміі, якая з іменем вялікага Сталіна прынесла ў вёскі, мястэчкі і гарады Заходняй Беларусі радаснае, шчаслівае жыццё, раздаваліся бурныя апладысменты.

Тав. Жылянін падрабязна застанавіўся на практычных задачах рабочых троек, выбранных на фабрыках і заводах горада ў дапамогу Часоваму Упраўленню гор. Вільно.

— Часовае Упраўленне г. Вільно — гаворыць дакладчык — ставіць сваей бліжэйшай задачай навесці парадак на ўсіх фабрыках, заводах і пусціць іх на поўную магутнасць. Вялікую дапамогу ў гэтым павінны нам аказаць рабочыя тройкі.

— Рабочыя тройкі заклікаңы так арганізаваць сваю работу, каб кожны ўчастак гарадскога жыцця: снабжэнне горада, нармальная работа фабрык і заводаў быў пад кантролем рабочых троек. Для гэтага неабходна, каб рабочыя тройкі ўнікалі ва ўсе дэталі арганізацыі работы і збыта прадукцыі фабрык і заводаў. Нельга дапускаць становішча, калі асобныя гаспадары фабрык і заводаў, карыстаючыся стварыўшайся абстаноўкай імкнуцца зрываць нармальную работу прадпрыемстваў і гэтым дэзарганізаваць жыццё горада.

Выбраныя на агульных сходах рабочыя камітэты фабрык і заводаў прыступаюць да практычнай работы. Многія з іх зусім правільна зразумелі свае задачы і пачалі арганізоўваць працу на прадпрыемствах.

Вось к прыкладу рабочы камітэт фабрыкі „Электрыт". Усяго некалькі дзён прайшло з дня яго выбараў, а камітэт падняў і паставіў на вырашэнне важныя пытанні, звязаныя з нармальнай работай фабрыкі.

Рабочы камітэт фабрыкі выпрацаваў мерапрыемствы дапамогі гаспадару фабрыкі ў хутшэйшым пуску фабрыкі. Прадуманы і шляхі арганізацыі дапамогі рабочым і работніцам фабрыкі і культурнага абслугоўвання калектыва.

Але многія рабочыя камітэты, выбраныя на сходах рабочых і работніц прадпрыемств да гэтага часу яшчэ не прыступілі да практычнай сваей работы і не ведаюць як яе трэба пачынаць. Арганізацыя рабочых камітэтаў справа новая і таму ім патрэбна паўсядзенная дапамога і кіраўніцтва ў рабоце.

Задачы выбраных на агульных сходах рабочых камітэтаў фабрык і заводаў састаяць у тым, каб забяспечыць неадкладную нармальную работу прадпрыемств. Трэба прыняць усе меры к таму, каб на працягу 1—2 дзён усе фабрыкі і заводы былі пушчаны ў ход.

Пярвейшым абавязкам кожнага рабочага камітэта з'яўляецца забяспечыць пуск свайго прадпрыемства. Рабочы камітэт павінен дэталёва вывучыць усе прычыны чаму не работае фабрыка ці завод. Выявіць прычыны, знайсці асноўны тормаз — гэта азначае навесці парадак на прадпрыемстве і забяспечыць усім рабочым і работніцам работу.

Трэба выяўляць і факты сабатажа асобных прадпрыемцаў, якія свядома затрымліваюць пуск фабрыкі ці завода.

Да ўсіх тых, хто сабатуе і не налажвае работы прадпрыемств і гэтым самым пазбаўляе работы соцен і тысяч рабочых павінны ўжывацца меры, указанныя ў пастанове Часовага Ўпраўлення гор. Вільно. Усім гэтым і павінны штодзённа займацца рабочыя камітэты фабрык і заводаў,

Вельмі важнае месца ў паўсядзеннай рабоце рабочых камітэтаў павінна заняць абарона інтарэсаў рабочых і работніц ад посягацельств прадпрынімацеляў. Камітэты штодзённа павінны клапаціцца аб жыццёвых умовах, культурным абслугоўванні рабочых і работніц.

Рабочыя камітэты павінны павясці рашуча барацьбу са спробамі сабатажа асобных гаспадароў, забяспечыць бесперабойную работу ўсіх фабрык і заводаў горада — такава неадкладная задача рабочых камітэтаў.

— Вельмі важнай умовай наладжвання нармальнага жыцця горада з'яўляецца работа фабрык і заводаў. Трэба дабіцца таго, каб на кожным прадпрыемстве работалі ўсе рабочыя, якія былі звоЛены з работы ў пачатку германапольскай вайны.

— Рабочыя тройкі абавязаны дапамагчы Часоваму Ўпраўленню ліквідаваць у горадзе беспрацоўе. Для гэтага трэба пусціць усе фабрыкі і заводы і прыняць на работу ўсіх, хто работаў на іх у даваенны час. Да ўсіх тых уладароў прадпрыемстваў і магазінаў, якія будуць сабаціраваць пастановы Часовага Ўпраўлення, трэба будзе прымаць рашучыя меры і ўнушыць ім, што яны паступаюць няправільна.

— Не хадайнічаць аб матар'ялах і сыравіне, а прымусіць гаспадара аднавіць работу свайго прадпрыемства на поўны ход — вось задача рабочых троек і рабочых камітэтаў фабрык і заводаў. Так і толькі так трэба зараз паступаць, каб хутчэй навясці парадак і наладзіць нармальнае жыццё ў горадзе.

У буры доўганезмаўкаючых апладысментаў тонуць словы прывітання гераічнай Чырвонай Арміі і здравіца ў чэсць таварыша Сталіна, правазглашоныя тав. Жылянiным. Увесь зал ўстае і доўга апладыруе сваёй вызваліцельніцы, свайму дарагому правадыру, які ўзяў працоўных Заходняй Беларусі ў свае цеплае бацькоўскае аб'яцце, тав. Сталіну. З ўсіх бакоў раздаюцца воклічы: „Ура таварышу Сталіну", „Няхай доўгія годы жыве наш родны Сталін", „Слава гераічнай Чырвонай Арміі", „Ура вялікаму Совецкаму народу".

У заключэнні схода быў дан канцэрт ансамбля народнага танца СССР. Цёпла былі сустрэты на сцэне выканаўцы народных танцаў. Перапоўнены зал садрагаўся ад авацый Совецкаму народу, дружнай сям'е краіны соцыялізма і слаўнай рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі.

У апошнюю мінуту

Прыём вышэйшых чыноў германскай арміі ў Гітлера

БЕРЛІН, 1 кастрычніка (ТАСС). Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, Гітлер па прычыне сканчэння вайны ў Польшчы прыняў 30 верасня вышэйшых чыноў германскай арміі, кіраваўшых ваеннымі аперацыямі ў Польшчы. На прыёме прысутнічалі: галоўнакамандуючы ваенна-паветранымі сіламі генерал-фельдмаршал Герынг, галоўнакамандуючы ваенна-марскімі сіламі адмірал Рэдэр, галоўнакамандуючы германскай арміі генерал палкоўнік Браухіч, кіраўнік вярхоўнага камандавання ўзброеных сіл генерал-палкоўнік Кейтэль, камандуючыя армейскімі групамі Поўдня і Поўначы генерал-палкоўнік Рундштэдт, генерал-палкоўнік Бок і рад іншых прадстаўнікоў вышэйшага ваеннага камандавання. Гітлер выразіў падзяку ўсім прысутным на прыёме за поспехі ў кіраўніцтве войскамі і ўручыў камандуючым узнагароды.

—:::—

Камюніке германскага камандавання.

БЕРЛІН, 1 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва „Трансацэан" перадае па радыё, што сёння германскае вярхоўнае камандаванне апублікавала наступнае камюніке: „На ўсходзе передача нашым войскам Варшавы і Модліна праходзіць адпаведна з намечаным планам. На захадзе ў раёне Саарбрукена непрыяцель развівае ўзмоцнены артылерыйскі агонь. У другіх месцах фронта — становішча без перамен. Нашымі самалётамі збіта: на захадзе 2 французскія і 10 англійскіх самалётаў і над Паўночным Морам 2 англійскія самалёты. Мы страцілі 2 самалёты".

—:::—

Водгукі латвійскага друку на пакт узаемадапамогі паміж СССР і Эстоніяй

РЫГА, 30 верасня (ТАСС). Газета „Рытас" у артыкуле „Важны дагавор" піша: „У Маскве ўчора падпісана два важныя дагаворы. Паміж СССР і Эстоніяй падпісаны дагавор аб узаемадапамове і гандлёвы дагавор і паміж Германіяй і СССР дагавор аб дружбе і граніцы". Вылажыўшы коратка змест совецка-эстонскага пакта, газета далей піша: „Дагавор аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй прадугледжвае яшчэ больш шырокае загадненне паміж абедзвюма дзяржавамі. Пры чым гэтыя дзяржавы аднадушна выкажуць саюзнікам свае пагляды, жадаючы, каб у найхутчэйшым часе скончылася вайна і быў забяспечан мір. Аснова гэтага дагавора, гэта забяспечыць мір Ува Ўсходняй Еўропе і забяспечыць мірнае існаванне жывучым тут народам, адпавядаючым іх нацыянальным асаблівасцям"



Група ўдзельнікаў Дзяржаўнага ансамбля народнага танца СССР

фото Сапір

НАСТАЛА КІПУЧАЕ ЖЫЦЦЕ

Раніцой, 30 верасня, мы наведалі скураны завод „Сальман“ і кансервную фабрыку „Балтык“.

Рабочыя з усіх бакоў акружылі нас, сталі расказваць пра сваё праклятае прошлае жыццё, распытваць пра работу і жыццё рабочых у Совецкім Саюзе.

— Цяжка словамі перадаць аб усіх здзеках, якія чыніліся над намі польскай шляхтай і памешчыкамі, — расказвае рабочы Канстанцін Салейка. — Крыўдна было да слёз, думаеш, за якіх-небудзь 100—150 кілометраў ад нас людзі жывуць вольна, радасна, а тут табе і сонца не відаць сярод соннечнага дня. Праца наша на заводзе зусім дрэнна аплачвалася. За нядзелю я мог зарабіць, калі папрацую больш 12 гадзін, толькі 35 злотых. Хіба гэта заработак? Гэта слёзы, а не заработак. За гэтыя 35 злотых трэба было пракарміць 5 душ сям'і, плаціць за кватэру, за электрасвет, вучыць дзяцей, плаціць падаткі. Жыццё было, таварышы, вельмі цяжкім.

Потым пачынае гаварыць рабочы таварыш Канстанцін Валюкевіч.

— Праўда, таварышы, польскія паны і фабрыканты не давалі нам, рабочым, вольна дыхнуць. Усе дваццаць год яны трымалі нас у цемнаце, голадзе і галечы. Вось я ўжо на заводзе „Сальман“ працую 5 год. Што я бачыў добрага за гэты час? Нічога. Толькі і ведаў працаваць на пана, ды яшчэ як працаваць, ад цямна да цямна. Кіно, тэатр для нас былі недаступны. Аб вучобе дзяцей у вышэйшых навучальных установах мы і не думалі, бо за навучанне трэба было плаціць вялікія грошы. Хто гэта мог асіліць з рабочых? Эх... праклятае было жыццё наша, таварышы...

Вялікае дзякуй Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, нашым братам па класу, што вызвалілі нас ад вечнай кабалы польскіх паноў і капіталістаў, адчынілі дзверы на светлую, шчаслівую дарогу. Зараз мы зажывём так, як спадабаецца нам.

Аб цяжкім сваім жыцці расказалі таксама рабочыя Грымовіч, Купыневіч і другія. Усе яны праклінаі польскіх паноў і памешчыкаў—злейшых ворагаў працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

* * *

Не лепшае жыццё было рабочых і работніц на фабрыцы „Балтык“. Тут без усякай літасці эксплаатавалі рабочых. Жыццё рабочых крайне прымітыўнае: доўгі рабочы дзень, дрэнныя кватэрныя ўмовы. Амаль увесь свабодны час работніца праводзіла дома. Заработак зусім нізкі.

Вось што расказвае работніца тав. Міхалевіч

— Я шэсць месяцаў была беспрацоўнай. А за што, каб запытаць у нашых гаспадароў? За тое, што я і мае калегі ўступілі ў прафсаюз. Нашы гаспадары Левін, Гінзбург і Шукстэлінская былі супроць усякіх прафсаюзаў. Яны ненавідзелі тых рабочых і работніц, якія ўступалі ў прафсаюзы, звальнялі з фабрыкі.

Асабліва была ненавісная для рабочых і работніц Шукстэлінская. Яна ненавідзела беларусаў і яўрэяў. Зімою рабочых выганяла на мароз, не давала пастаяць у калідоры фабрыкі. Работніц называла ўсялякімі пахабнымі словамі. За размову ў час працы яна не дапускала на работу на 2—3 дні.

— Нашы панкі, — расказвае таварыш Ольга Гельфон, — усіх нас беларусаў і яўрэяў лічылі і цяжкіх пакутах. За нашу працу, за нашы крывавыя мазалі, яны набівалі свае кішэні, гадавалі жываты. А нам плацілі адны толькі грошы. Напрыклад, я за нядзелю зарабляю самае большае 10 злотых. Муж мой ужо тры гады з'яўляецца беспрацоўным. Яго не бралі на працу таму, што ён з'яўляецца рускім нацыяналам.

Мы, даведаўшыся, што граніцу перайшлі совецкія войскі, адразу павесялелі. Адразу стала святлей жыць на свеце. Ідзем зараз па горадзе і радуемся. Кругом свае людзі. Нястала афіцэраў, чыноўнікаў і паліцэйскіх.

На трэці дзень, пасля ўступлення часцей Чырвонай Арміі ў горад Вільна, на фабрыцы і заводзе былі створаны рабочыя камітэты, якія адразу ўзяліся за наладжванне нармальнай работы прадпрыемстваў.

Кіпучае, баявое жыццё настала на фабрыцы і заводзе.

І. Матыль.



Артыст Дзяржаўнага ансамбля народнага танца СССР тав. Танхо Ізраінаў выконвае армянскі танец.

Выбраны сялянскія камітэты

На агульным сходзе сялян вёскі Міхалішкі, Віленска-Трокскага павета, прысутнічала 305 чалавек. З вялікай ўвагай сабраўшыеся выслухалі даклад прадстаўніка Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі аб міжнародным становішчы і рашэнні Совецкага Ўрада аб аказанні дапамогі адзінакроўным братам беларусам і украінцам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Выступаўшые сяляне расказалі аб сваім цяжкім жыцці пад пятой польскіх паноў і аб вялікай радасці, з якой яны сустрэлі вызваліцельніцу працоўных Заходняй Беларусі — Чырвоную Армію. Усе выступаўшыя дзякавалі Совецкі Урад, Чырвоную Армію і таварыша Сталіна за аказаную ім брацкую дапамогу вызваліцца з ярма польскіх паноў.

На гэтым-жа сходзе быў выбран сялянскі камітэт. У склад камітэта ўвайшло 9 чалавек. Старшынёй камітэта выбран тав. Петрашыцкі.

* * *

Выбраны сялянскі камітэт Рудомінскай воласці, Віленска-Трокскага павету. У склад камітэта ўвайшло 7 чалавек. Старшынёй камітэта выбран селянін-бядняк вёскі Рудоміна Ількевіч Нікалай Маркавіч.

Сялянскі валасны камітэт разгарнуў сваю работу ў вёсках па ахове маемасці маёнткаў, лясоў. Камітэт арганізаваў адмер памешчыцкай зямлі сялянам вёсак.

* * *

З 7 чалавек выбраны сялянскі камітэт у Тургельскай воласці. У склад увайшлі сяляне-бедпякі і серадпякі акалічных вёсак. Старшынёй сялянскага камітэта воласці выбран Іван Шаткевіч.

НА БІРЖЫ ПРАЦЫ

Чырвоная Армія прынесла з сабой у Вільно не толькі новы струмень радасці і шчасця, але адкрыла таксама новыя крыніцы атрымання работы.

Аб'явы, вісеўшыя раней у цэлым радзе дзяржаўных і прыватных устаноў і паведамляўшыя ўсім імкнуўшымся атрымаць работу, што „свабодных месц няма“, зніклі зусім. У той-жа час на вуліцах горада павіліся аб'явы, заклікаючыя ўсіх работнікаў фізычнага і разумовага труда неадкладна зарэгістравацца на біржы працы (вул. Субоч 22).

Разам з гэтым, пры Віленскім Гарадскім Упраўленні адкрыўся аддзел труда — установа да гэтых пор нам, віленчанам, невядомая.

Мы адправіліся на Біржу працы.

На адлалёнай, вузкай і заўсёды пакідаўшай сумнае ўражанне вуліцы сёння вялікае ажыўленне. Не пазнаць гэтай вуліцы. Натоўпы людзей імкнуліся і спяшаліся да дома № 22.

У памяшканні Біржы вялікая чарга. Тут можна сустрэць людзей рознастайных прафесій: рабочых, інжынераў, тэхнікаў, юрыстаў, настаўнікаў і т. д. — усіх не пералічыць.

Адчак гэта ўжо не была чарга людскіх мас, што з пагасшымі, поўнымі безнадзейнасці позіркамі прыходзілі сюды з напраснай надзеяй атрымаць работу хоць на два дні ў месяц

Зараз усё перамянілася!

Жадаеш работы па спецыяльнасці — зарэгіструйся і атрымаеш яе.

Загадчык Біржы тав. Краскоў сам прымае наведвальнікаў, з якімі абыходзіцца па-таварыску, прыветліва.

— У нас беспрацоўных няма, — падкрэслівае тав. Краскоў.— У нас наадварот, недахоп рабочай сілы. Склаўшы рукі ніхто з вас не будзе сядзець. Усе атрымаеце работу і будзеце весела і шчасліва жыць.

У кабінет загадчыка ўваходзіць судовы практыкант. Беспрацоўны юрыст скардзіцца:

— Мае таварышы-палякі з універсітэцкай скамʼі займалі кіруючыя і выгадныя пасты ў дзяржаўных установах. Былі сярод іх пракуроры і суддзі, а я ўвесь час заставаўся беспрацоўным, бо я яўрэй.

Затым уваходзіць малады хлапец. Ён паказвае свае шырокія працоўныя далоні.

— Паглядзіце! Гэтыя рукі ўжо два гады не мелі работы, а яны маглі-б многа — многа зрабіць...

Беспрацоўны журналіст кажа:

— Я працаваў 15 гадоў у віленскіх газетах і ні разу не карыстаўся адпачынкам.

Сотнямі, тысячамі прыходзяць сюды працоўныя. Частка з іх неадкладна атрымоўвае работу, а частка — ўпэўнена чакае сваёй чаргі.

„У нас беспрацоўных няма“ — гэтыя крылатыя словы, прынесла з сабой Чырвоная Армія, якіх працоўныя Вільно на працягу доўгіх гадоў не чулі, а толькі марылі аб іх.

С. Жалудскі.

Новая калгасная гідраэлектрастанцыя

У Шаршунскім сельсовеце Заслаўскага раёна (БССР) на рацэ Удранка заканчваецца будаўніцтва новай калгаснай гідраэлектрастанцыі. У першай палове кастрычніка пачнуцца мантажныя работы. Будзе дадзена электрычнасць сельска-гаспадарчай арцелі „Чырвоная варта“ і арцелі імя XVI партз'езда. У дамах калгаснікаў, гаспадарчых будынках запаліцца каля 200 лампачак Ільіча.

Станцыя павінна быць пушчана ў эксплаатацыю ў гэтым годзе. Яе магутнасць — 15 кілават.

Набываюць брашуры з матар'яламі XVIII з'езда ВКП(б)

Свенцяны. У горадзе Свенцяны створана Часовае Ўпраўленне з прадстаўнікоў працоўных горада. Упраўленне праводзіць масава-палітычную работу, сярод насельніцтва, клапоціцца аб забеспячэнні беднякоў прадуктамі харчавання, палівам. У вёсках прадстаўнікі Часовага Ўпраўлення, разам з сялянскімі камітэтамі раздаюць сялянам панскую зямлю, збожжа для сяўбы, коней і сельскагаспадарчы інвентар.

У горадзе жыццё стала іншым па-новаму. Сюды штодзённа прывозяць совецкія газеты, як „Правда“, „Комсомольская правда“, „Звязда“, „Советская Беларусь“ і іншыя.

Многія жыхары горада набылі брашуры з матар'ямамі XVIII з'езда большэвіцкай партыі, „Кароткі Курс Гісторыі ВКП(б)“, прамову таварыша Молатава на Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета Саюза ССР.

Працоўныя горада ад усяго сэрца дзякуюць совецкі народ, доблесную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію за аслабаненне ад панскага гнёту.

Канцэрты ансамбля народных інструментаў

Учора ў памяшканні тэатра „Лютня“ адбыліся два першых канцэрты Дзяржаўнага ансамбля народных інструментаў БССР. Першы канцэрт быў дан для чырвонаармейцаў, другі для насельніцтва г. Вільно. Цёпла сустрэлі гледачы ўдзельнікаў ансамбля.

Сёння для працоўных горада адбудуцца яшчэ тры канцэрты ансамбля.

Будзем працаваць па новаму

28 верасня на фабрыцы „Эсброк-радыё“ адбыўся сход рабочых. На сходзе прысутнічала 40 чалавек.

У сваіх выступленнях удзельнікі схода адзначылі, што фабрыка „Эсброк-радыё“ на працягу 1939 года амаль не працавала. Больш 70 чалавек было без работы.

Таварыш Кац, выступаючы на сходзе, сказаў:

„Доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія прынесла працоўным Заходняй Беларусі новае, раднае жыццё і дала магчымасць будаваць нам самім, быўшым беспрацоўным, новы быт, новае жыццё.

Затым рабочыя выбралі камітэт, які займецца пытаннем наладжвання работы фабрыкі. Большасцю галасоў у камітэт выбраны таварышы Кац Саламон, Рэйзін Густа і Войчык Рувім.

У прынятай рэзалюцыі рабочыя пішуць:

„Мы дзякуем Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі за брацкую дапамогу, аказаную нам, працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, у вызваленні ад кабалы польскіх паноў і памешчыкаў.

Пасылаем нашу ўдзячнасць і наша прывітанне ўсім народам СССР, Совецкаму Ўраду і другу ўсіх працоўных таварышу Сталіну.

Заходняя Беларусь

Пасля таго, як польская дзяржава, пабудаваная на прыгнечанні, на рабаўніцтве нацыянальных меншасцей, аказалася нежыццездольнай і распалася, паказаўшы ўсю сваю несастаяцельнасць, Совецкі Ўрад палічыў сваім свяшчэнным абавязкам дапамагчы народам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія перашла граніцу з тым, каб узяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць нашых адзінакроўных братоў беларусаў і ўкраінцаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі былой польскай дзяржавы. Тыя народы, якія знаходзіліся раней пад цяжкім гнётам, пасля бегства ўрада, аказаліся зусім пакінутымі на волю лёсу. З захапленнем і радасцю сустрэлі яны сваіх асвабадзіцеляў — совецкія войскі.

Нельга апісаць усяго цяжару жыцця беларускага народа, якое яшчэ ўчора было фактам. Польскія паны — капіталісты і памешчыкі ператварылі Заходнюю Беларусь у сваю калонію, а беларускіх рабочых разглядалі, як каланіяльных рабоў.

Польскі імперыялізм праводзіў палітыку знішчэння нават той слаба развітай прамысловасці, якая тут была раней.

Да сусветнай вайны 1914—18 г. у Заходняй Беларусі налічвалася 9 фабрык з колькасцю рабочых звыш 100 чалавек, а цяпер засталіся ўсяго дзве такія фабрыкі. У Заходняй Беларусі наогул было забаронена будаваць якія-небудзь прамысловыя прадпрыемствы без асобага дазволу ваенных уладаў. Сярэдняя заработная плата рабочых у Навагрудскім ваяводстве складала не больш 35%, у Палескім — не больш 45% і Віленскім не больш 56% зарплаты сельскага рабочага Варшаўскага ваяводства.

Сельская гаспадарка Заходняй Беларусі адрознівалася выключнай адсталасцю ва ўсей Польшчы. Плуг тут сустракаецца рэдка, а ўвесь інвентар складае дзеравяная саха.

Памешчыцкае землекарыстанне займала палавіну ўсёй зямлі. На Палессі ў руках адной тысячы памешчыкаў было $^2/_3$ усёй зямельнай плошчы, а ў 70 тысяч беларускіх сялян-беднякоў менш $^1/_{16}$ часткі зямлі.

У сваіх велізарных маёнтках памешчыкі вялі драпежніцкую гаспадарку. У іх не было ні трактараў, ні сучасных удасканаленых сельска-гаспадарчых машын і прыладаў таму, што памешчыкі лічылі больш выгадным для сябе выкарыстоўваць танную працу сялян. Памешчыкі вельмі мала наймалі батракоў, а выкарыстоўвалі галоўным чынам працу акалічных сялян-унукаў і праўнукаў сваіх прыгонных. Памешчыцкая зямля часта апрацоўвалася сялянскім інвентаром.

Памешчыкі прымянялі сістэму выдачы задаткаў і пазык на адработак вясной і летам. Падатковы гнёт руйнаваў сялянскія гаспадаркі. Агульная сума ўсіх сялянскіх падаткаў складала не менш 40 процантаў усяго дахода сялянскай гаспадаркі. Даўгі сялянства былі вялікія. Пагашэнне даўгоў і ўплаты процантаў па іх было магчымым толькі пры ўмове пралажы зямельнага ўчастка, інвентара, жывёлы і г. д.

Большасць насельніцтва недаедала. Гадавое спажыванне масла і цукру ў сем'ях дробных сялянскіх гаспадарак ледзь дасягае 1—2 кілограмаў. Нават керасін для сялян быў недаступнай роскашшу. У большасці сялянскіх хат таксама як і стагоддзі таму назад умацавалася лучына.

Вось што піша селянін з Астроўскага ўезда аб палажэнні сялян: „Ужо к новаму году ў вёсках арудзы пустыя. Хлеб сяляне ядуць толькі адразу пасля жніва таму, што пасля зборкі з палёў ураджай павінен быць прададзен на аплату падаткаў. Масла сяляне спажываюць толькі ў вялікія святы. Яйкі, малочныя прадукты усе ідуць на продаж. Прадукты нашай прамысловасці вельмі дарагі, каб сяляне змаглі іх купляць. Мы жывём амаль у першабытных умовах. Даволі прайсці па нашых сялянскіх хатах, каб пераканацца, што ні ў адной з іх няма ні тарэлак, ні лыжак. Усе ядуць з аднэй міскі.

Аб становішчы ў Палескай вёсцы пісала ў наступных выражэннях нават буржуазная газета „Вечур Варшаўскі“: „Селянін не ўжывае больш жалезных рэчаў, замяняючы іх усюды дзеравянымі. Ён перастае ўжываць тапор таму, што стары сапсаваўся, а на новы няма грошай. Калі трэба што-небудзь рассячы, то робяць гэта каменным та аром, які робіцца вядомым спосабам дагістарычнай каменнай эпохі“.

Польскія ўлады бязлітасна зачынялі беларускія культурныя ўстановы і школы. Ва ўсёй Заходняй Беларусі на 3 мільёны чалавек насельніцтва было ўсяго 16 беларускіх пачатковых школ. Ва ўсёй Польшчы існавала толькі адна беларуская сярэдняя школа.

Зусім адсутнічалі беларускія настаўніцкія семінарыі. На 4.654.000 дзяцей, якія вучыліся ў школах Польшчы, усяго толькі 2.000 дзяцей навучаліся ў беларускіх школах.

У навагрудскім ваяводстве, дзе палякі складаюць 25% насельніцтва, налічвалася 93% польскіх школ, а беларускіх усяго 2,5%. У палескім ваяводстве палякі складаюць менш 10% насельніцтва, а польскіх школ было 94%. 73% насельніцтва палескага ваяводства непісьменныя. Беларуская літэратура і мова праследаваліся. Беларусы не мелі доступа ні на якія пасады ў адміністрацыйным апараце.

Сваё панаванне над бяспраўнымі беларусамі польскія ўлады падтрымлівалі шляхам карацельных экспедыцый, палявых судоў, расстрэламі. Усе турмы былі перапоўнены сялянамі, якія прабавалі падняцца супроць кабалы польскіх паноў.

Настаў радасны светлы час для працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Заходняя Беларусь вызвалена з ярма польскіх паноў, нацыянальнага ўціску і парабашчэння польскімі панамі.

Доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія краіны сацыялізма вызваліла працоўных Заходняй Беларусі ад польскага іга і прынясла ім радаснае і светлае жыццё. Чырвоная Армія з чэсцю выконвае свой інтэрнацыянальны доўг, наказ сваёй горача любімай радзімы і ачышчае родную беларускую зямлю ад падонкаў польскіх паноў.

З глыбіні сэрцаў вызваленых рабочых і сялян Заходняй Беларусі нясецца радасны прывет, словы любві і урачыстае прывітанне правадыру народаў Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Краіна Советаў — невычарпальная крыніца народных талантаў

Неперадаваемае ўражанне

53 гады пражыў я на свеце. Апошнія 20 год прыйшлося жыць у жудасных умовах, выносіць гнёт і парабашчэнне польскіх паноў. Жылі працоўныя Заходняй Беларусі, як у турме. Не ведалі асалоды жыцця свайго.

Для пролетарыеў, якія гнулі сваю спіну для нажывы капіталістаў, было не да культурнага адпачынку. Прыходзіш бывала з работы і свет не міл. Дома нястача, пустата. Пры такіх умовах жыцця не падумаеш аб кіно, тэатры, канцэртах. Ды і не для нас усё гэта было.

За 20 год мне давялося адзін раз пабываць на канцэрце ў тэатры. Пасля гэтага я зарокся хадзіць больш па тэатрах.

Сядзеў я тады ў тэатры, слухаў канцэрт і праклінаў сябе за тое, што пайшоў сюды. Жалеў, што так марна страціў вольны ад работы час і нікольки не адпачыў.

Памятаю на сцэне паказваліся нейкія дзецкія забавы дарослымі артыстамі. Глядзець было такую дрэбедзень проста сорамна. Ніякага мастацтва ў ігры артыстаў не было.

Зусім інакш адчуваў я сябе, калі прысутнічаў на канцэрце Дзяржаўнага ансамбля народнага танца СССР. Вось тут, перад маімі вачыма прайшлі сапраўдныя артысты сапраўднага мастацтва.

У захапленні я быў ад выканання ўсіх танцаў народаў дружнай і магутнай сям'і краіны соцыялізма. Радасцю напаўняецца сэрца, калі ты глядзіш і ўпіваешся майстэрствам народнай творчасці, танцамі народаў СССР. Тут і беларускія, украінскія, грузінскія і рускія танцы.

Я сядзеў у захапленні ад майстэрства выканаўцаў танцаў. Быў рад за тое, што мне на старасці год давядзецца жыць і работаць у гэтай дружнай брацкай сям'е народаў, быць сагрэтым залатымі праменнямі Сталінскай Канстытуцыі. Гордасць усялілася ў мяне за совецкі народ, які стварыў такое жыццё.

Сядзеў я і думаў, што вось такі дружны народ ніколі і нікім непераможны. Сапраўды народная дружба вялікая і непераможная сіла.

Гэта вялікая дружба многанацыянальнага совецкага народа, грозная сіла для ўсіх ворагаў.

Фэлікс Добравольскі
рабочы лесазавода Гінзбурга.

Мастацтва шчаслівага народа

Наша гераічная Чырвоная Армія вызваліла Заходнюю Беларусь з ярма польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Яна прынесла народу вызваленне ад нацыянальнага і соцыяльнага ўціску і дала магчымасць працоўным азнаёміцца з самай перадавой совецкай культурай і мастацтвам. Працоўныя Вільно ўжо глядзелі ў кінотэатрах горада такія выдатныя творы совецкага кіномастацтва як „Чалавек з ружжом“, „Ворагі“ і інш.

30 верасня ў гарадскім тэатры выступіў прыехаўшы з Масквы ансамбль народных танцаў Саюза ССР пад мастацкім кіраўніцтвам ордэнаносца Ігара Майсеева. У першыню ў гісторыі працоўныя Вільно ўбачылі багацце, прыгожасць і росквіт совецкага мастацтва, і ў прыватнасці народнага танца. Выдатны ансамбль прадэманстраваў выключны рост культуры шматлікіх народнасцей СССР і іх шчаслівае і радаснае жыццё.

Праграма канцэрта пачалася выкананнем беларускага народнага танца „Лявоніха“. Гэты танец прывабны і імклівы выклікаў усеагульнае захапленне ў гледачоў. Таксама майстэрскі быў выканан другі беларускі народны танец „Крыжачок“, „Мяцеліца“, армянскія, азербайджанскія, малдаванскія, калмыцкія і танцы іншых народнасцей Совецкага Саюза.

Захапляючае і прыгожае відовішча! Адчуваецца старанная, сумленная работа ўсяго калектыва і яго мастацкага кіраўніка. Варта адзначыць, што з надзвычайным густам падабраны касцюмы.

Пакідае добрае ўражанне і аркестр народных інструментаў, які суправаджае ансамбль. Сапраўды віленскія гледачы яшчэ ніколі не атрымалі такога задавальнення, як ад канцэрта ансамбля народных танцаў СССР. Цяжка нават перадаць простымі словамі, як цёпла ўсе прысутныя ў зале сустракалі кожнае выступленне артыстаў. Усе танцы праходзілі пад восторжаныя авацыі. Людзі ўставалі з месц і лозунгамі горача віталі совецкіх артыстаў, вялікую Совецкую краіну, любімую партыю Леніна-Сталіна.

— Гэты канцэрт запамятаю на ўсё жыццё, — сказаў рабочы пекар тав. Меераў. — Што ведалі мы дагэтуль? Цяжкую, паднявольную працу. Тэатр, мастацтва нам недаступны былі. А тут я бачыў артыстаў, якіх выхаваў совецкі народ. Так добра, тэмпераментна, радасна могуць танцаваць толькі нашы родныя совецкія артысты. Я ніколі не бачыў такую прыгожасць і можа быць ніколі-б не ўбачыў, калі-б не наша вызваліцельніца, магутная Чырвоная Армія.

Слесар тав. Аншэр расказвае, што тэатр наведвалі толькі буржуі, а шмат працоўных горада сёння наогул упершыню ўбачылі глядзельны зал тэатра свайго роднага горада...

Канцэрт ансамбля народных танцаў СССР прайшоў з вялікім поспехам. Кожнае выступленне совецкіх артыстаў—гэта сапраўдная народная ўрачыстасць, урачыстасць вызваленага народа, які хутка створыць сваё свабоднае, перадавое мастацтва.

Н. Грозаў.

З хваляваннем слухаў канцэрт

На старонках „Віленскай Праўды“ я жадаю выразіць тое вялікае задавальненне і радасць, якую пераэкыў на адбыўшымся 30 верасня, у памяшканні Вялікага Гарадскога Тэатра канцэрце ансамбля народнага танца Саюза ССР.

Звыш 20 год жыў я пад гнётам польскага фашысцкага рэжыма, пад якім я пакутаваў двойчы, як працоўны і як яўрэй. Цяпер, з прыходам Чырвонай Арміі — Асвабадзіцельніцы, літаральна змянілася карціна нашага жыцця.

Прайшло ўсяго 10 дзён, але якая вялікая розніца! За гэтыя 10 дзён я ўжо паспеў упітаць у сябе столькі новых уражанняў і жыццёвай радасці, якой нам, за ўсе пражытыя 20 год, не здаралася адчуваць.

Седзячы на канцэрце народнага танца Саюза ССР з маім 7-гадовым сынам, я адчуў, што ва мне перачнуўся свабодны чалавек. Я пражыў усё бачанае на сцэне, наглядаючы здзіўленым поглядам за поўнымі эстэтыкі танцамі, прастатой і грацыёзнасцю руху мастацкага ансамбля.

Няхай жыве вызваленая Заходняя Беларусь! Няхай жыве магутная Чырвоная Армія — наша Вызваліцельніца ад капіталістычнага гнёта. Няхай жыве наш вялікі правадыр і вызваліцель таварыш Сталін!

Абрам Аншэр
Член Рабочай Гвардыі
1-га батальёна.

Канцэрт вольнага народа

30 верасня, у гарадскім тэатры быў дан канцэрт ансамблем народнай пляскі Саюза ССР. Канцэрт выразна паказаў усе магчымасці, якія прадстаўлены ў Совецкім Саюзе для развіцця вольнага многанацыянальнага народнага мастацтва.

— Мне — рабочаму, прыходзілася, хоць і вельмі рэдка, раней прысутнічаць на канцэртах. Але хіба можна параўнаць канцэрты, на якіх я быў раней, з тым, што я ўбачыў учора?

Гэты канцэрт натхняе слухачоў на далейшую барацьбу за вольнае шчаслівае жыццё. Нам — працоўным паны і капіталісты гаварылі, што ў Совецкім Саюзе рабочыя цяжка працуюць і галадаюць. Гэта яны рабілі з мэтай, каб адцягнуць позіркі працоўных ад Вялікага Совецкага Саюза.

Канцэрт паказаў, якія шырокія магчымасці прадстаўлены ў Совецкім Саюзе для росквіту культуры, для росту талантаў і для шчаслівага радаснага жыцця.

М. Куц.
Рабочы мехавога завода „Фурс“

Рады, што будзем жыць і працаваць у дружнай сям'е народаў СССР

Мала сказаць, што канцэрт Дзяржаўнага ансамбля народнага танца СССР мне проста спадабаўся. Гэтага мала і гэтым нельга выразіць усяго пачуцця, якое я перажываў, прысутнічаючы на канцэрце.

Я быў захоплен ніколі не бачанай, такой сапраўды народнай творчасцю. Усе выканаўцы народных танцаў — дзеці рабочых і сялян совецкага народа. Ужо адно гэта гаворыць аб вялікім значэнні развіцця мастацкай самадзейнасці ў народаў усіх нацыянальнасцей совецкай краіны.

Нельга было раўнадушна, без захаплення, глядзець народныя танцы. У кожным танцы адчувалася радаснае, творчае і вясёлае жыццё ў Совецкім Саюзе для ўсіх нацыянальнасцей.

Асабліва вялікае ўражанне на мяне зрабілі чырвонаармейскія танцы. У гэтых танцах паказана ўсё многагранкае жыццё магутнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Байцы і камандзіры Чырвонай Арміі не толькі авалодваюць ваеннай тэхнікай, але знаходзяць і час для культурнага адпачынку і вяселля.

Трэба сказаць, што такая творчасць народаў магчыма толькі ў Совецкім Саюзе, такой дружнай сям'е народаў, якой жыве многанацыянальная і многамільённая совецкая краіна. Толькі ў Совецкім Саюзе магчыма так радасна жыць і весяліцца.

Мы таксама зараз сталі жыць свабодна. Чырвоная Армія асвабаніла Заходнюю Беларусь ад іга польскіх паноў, вызваліла працоўных з ярма капіталістаў і памешчыкаў. Вечна мы будзем удзячны гераічнаму совецкаму народу за аказаную нам брацкую дапамогу ў вызваленні ад гнёта і парабашчэння польскіх паноў.

Гордасцю за такую слаўную нашу вызваліцельніцу — Чырвоную Армію, за гераічны совецкі народ напоўнены нашы сэрцы. Працоўныя свабоднай Заходняй Беларусі ўдзячны Чырвонай Арміі за сваё вызваленне, за тое, што яна прынясла нам свет і радасць, новае свабоднае жыццё.

Усе мы бязмежна рады таму, што будзем разам са ўсім совецкім народам будаваць радаснае жыццё, без памешчыкаў і капіталістаў. Прыложым усе сілы, каб з чэсцю аддзякваць за аказаную нам брацкую дапамогу совецкім народам і Чырвонай Арміяй.

Франц Якаўлевіч Тырлок
слесар чыгуначных майстэрань
ст. Вільно.



Калектыў Дзяржаўнага ансамбля народнага танца СССР
фото Дабравольскага і Сапір

Веснікі народнага совецкага мастацтва

Совецкае мастацтва неадрыўна ад совецкай сапраўднасці. У ім, як у люстры адлюстрован магутны росквіт і маналітнасць совецкай культуры.

Народы нашай радзімы, вольныя і шчаслівыя, твораць новае жыццё і новае мастацтва.

Незлічымыя і невычарпальныя багацці народнай творчасці з кожным днём становяцца ярчэй і прыгажэй.

З кожным днём становяцца радасней нашы песні, весялей музыка, імклівей танцы.

Як рэзультат гэтага магутнага росквіту нашага мастацтва нарадзіліся новыя тэатры, новыя мастацкія калектывы, сярод іх наш Дзяржаўны ансамбль народнага танца Саюза ССР. Ансамбль наш прызван адлюстроўваць і папулярызаваць лепшыя, класічныя ўзоры народнага харэаграфічнага мастацтва ў высока-кваліфікаваным віртуозным выкананні. Дзяржаўны ансамбль арганізаван у 1937 г. у Маскве пасля адбыўшыхся ў Лондане і ў Маскве міжнароднага і ўсесаюзнага фестываляў народнага танца.

Цэлы рад лепшых выканаўцаў нацыянальнага танца ўвайшлі ў наш калектыў. Многія з нашых артыстаў пачалі сваю артыстычную дзейнасць у гуртках рабочай і чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці і ў нашым калектыве выраслі кваліфікаванымі майстрамі — выканаўцамі народнага танца. Да іх адносяцца тав. Курыкку — у мінулым рахункавод; Туркоў, атрымаўшы цэлы рад прэмій за ўдзел у чырвонаармейскай самадзейнасці; Волкаў —былы чарцёжнік электразавода.

Ансамбль мае цэлы рад выдатных салістаў, атрымаўшых прафесіянальную артыстычную асвету. Іх выкананне адрозніваецца закончанасцю акторскага майстэрства і віртуознасцю тэхнікі. Сярод іх: Карташоў, Арсеньеў, Кобрава, Палянская, Зэйферт, Русакова.

За два гады сваёй работы ансамбль стварыў танцы 11 саюзных рэспублік і дваццаці сямі нацыянальнасцей, насяляючых Совецкі Саюз. У рэпертуары ансамбля маюцца рускія, украінскія, беларускія, грузінскія, армянскія, азербайджанскія, казахскія, узбекскія, татарскія, калмыцкія, малдаўскія, аджарскія, осетынскія, нанайскія, грэчаскія, венгерскія танцы. Ансамбль працягвае бесперапынна пашыраць свой рэпертуар і ў хуткім часе выпусціць рускія старынныя танцы поўначы, яўрэйскія танцы, казацкія, чырвонафлоцкія танцы, а таксама цэлы рад карцін і інсцэніровак з быта і гісторыі народаў СССР.

У бліжэйшы час мы выпусцім беларускі двухактавы балет «Юрачка», а затым з жыцця совецкай моладзі.

Дзейнасць ансамбля акружана заботлівай увагай нашага Совецкага Урада. Неаднаразова Дзяржаўны ансамбль выступаў на ўрачыстых вечарах у Вялікім тэатры і ў Крэмлі. Цэлы шэраг нашых артыстаў узнагароджаны вышэйшай нагрдай — Ордэнамі Совецкага Саюза. Ордэнамі «Знак почёта» узнагароджаны Кобрава, Арсеньеў і Барысаў. Аб высокім давер'і нам Урада і Палітычнага Ўпраўлення Рабоча - Сялянскай Чырвонай Арміі гаворыць наша пачэсная камандыроўка ў Заходнюю Беларусь к нашым адзінакроўным братам.

Наша вялікая Чырвоная Армія і наша совецкае мастацтва жывуць і работаюць заўсёды ў дружнай сувязі таму, што яны служаць справе будаўніцтва і абароны прагрэсіўнейшай культуры чалавецтва — культуры соцыялізма. Мы ведаем, што ў хуткім часе нашы браты з Заходняй Беларусі і Зах. Украіны з дапамогай вялікага совецкага народа створаць сваю вольную, яскравую і красачную культуру, сваё жыццерадаснае мастацтва.

Мы шчаслівы быць тут першымі веснікамі нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу культуры народнага мастацтва Совецкай краіны. Мы будзем рады ўключыць у наш рэпертуар новыя танцы нашых братоў з Заходняй Беларусі, якія ў хуткім часе ўзнікнуць у іх разам з роскві там іх багаццяў і шчасця і магчыма хутка ў наш дружны і шматнацыянальны калектыў вальюцца новыя таварышы-артысты выканаўцы танцаў народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія разам з намі будуць работаць і тварыць.

Ігар Майсееў —
ордэнаносец, мастацкі кіраўнік і начальнік Дзяржаўнага Ансамбля Народнага Танца Саюза ССР



Артысты Дзяржаўнага ансамбля танцаў СССР т.т. Мадык'янц і Мукалава выконваюць паўнёва-асецінскі танец „Сімд“

Канцэрты праходзяць з вялікім поспехам

Мы вельмі рады і шчаслівы, што нам выпала вялікая часць абслугоўваць байцоў Чырвонай Арміі і насельніцтва Заходняй Беларусі. Душа кожнага з нас была напоўнена радасным пачуццём, калі мы атрымалі паведамленне аб паездцы ў Заходнюю Беларусь.

Захапляючую сустрэчу нам наладзілі ў г. Глыбокім.

Першыя нашы выступленні далі нам новыя сілы для работы. Хацелася паказаць больш, работаць без перапынку.

На канцэрце ў Глыбокім прысутнічала вельмі многа сялян з навакольных вёсак нават старыкоў і дзяцей. Пасля канцэрта слухачы групамі падыходзілі, дзякавалі і прасілі, каб часцей да іх прыязджалі.

27 верасня намі быў дан першы канцэрт у гор. Вільно ў гарадскім тэатры для Чырвонай Арміі і работнікаў Польскага тэатра. Пасля кожнага выканання доўга працягваліся буйныя апладысменты. З воклічамі „брава, брава“, „няхай жывуць савецкія артысты“ кончылі праграму. Перад закрыццём заслоны выступіў дырэктар Польскага тэатра Леапольд Кіляноўскі. Ён сказаў: „Я і ўвесь наш калектыў нічога падобнага не бачылі. Мы з радасцю вітаем савецкіх артыстаў“.

З вялікім ажыўленнем прайшоў канцэрт 30 верасня для прадстаўнікоў рабочых троек.

Танхо Ізраілеў
Артыст ансамбля танца СССР

—:::—

Прывітанне братам Заходняй Беларусі

Першага канцэрта, які намячалася даць для шырокіх мас г. Вільно, я чакала з нецярплівасцю. Мне было цікава знаць, як прымуць наша мастацтва людзі, якія ўжо больш 20 год не мелі з намі ніякай сувязі.

Мяне трывожыла думка, ці зразумеюць яны нашы танцы, ці не будуць яны чужымі для нашых заходніх братоў.

І вось 29 верасня заслона гарадскога тэатра паднялася перад працоўнымі горада Вільно. Раздаліся гукі танца „Лявоніха“ — самага вядомага танца беларускага народа. Танец увесь час суправаджаўся апладысментамі, якія часта пераходзілі ў авацыю.

Актор вельмі тонка адчувае захапленне гледачоў і гэтае захапленне яшчэ больш усхвалявала мяне і маіх таварышаў.

Кожны з нас уклаў у свой танец максімум творчага запалу натхнення, а ў адказ ад гледачоў, раней для нас не знаёмых, а цяпер блізкіх і родных, атрымліваў буру апладысментаў.

Мая радзіма — горад Гродна і цяпер я з нецярплівасцю чакаю таго дня, калі змагу танцаваць перад жыхарамі свайго роднага горада. Цяпер я знаю, што ён мне так-жа блізкі, як і раней. 20 год, якія прайшлі пры панаванні польскіх паноў, не раз'ядналі мяне з маімі землякамі. Гэта нашы браты, якія нарэшце могуць падаць свой свабодны голас аб далучэнні іх да брацкіх народаў Савецкага Саюза.

Л. Осокіна
артыстка ансамбля

ЗА РУБЯЖОМ

Зварот фон Рыбентропа ў Берлін

БЕРЛІН, 1 кастрычніка (ТАСС). Агенцтва „Трансацэан“ паведамляе, што 29 верасня ў другой палове дня ў Берлін вярнуўся з Масквы германскі міністр замежных спраў фон Рыбентроп. Зараз па прыездзе ў Берлін Рыбентроп адправіўся да Гітлера для асабістага даклада.

—:::—

Бэку адмоўлена ў візе на выезд з Румыніі

БЕРЛІН, 29 верасня (ТАСС). З Белграда паведамляюць, што румынскі ўрад канчаткава адмовіў былшаму польскаму міністру замежных спраў Бэку выдаць візу на выезд з краіны. Гэта пастанова таксама пашыраецца на ўсіх уцёкшых у Румынію, членаў былшага польскага ўрада. Усе яны будуць інтэрніраваны ў Румыніі.

—:::—

Канфіскацыя польскага золата румынскім урадам

БЕРЛІН, 30 верасня (ТАСС). З Будапэшта перадаюць, што для пакрыцця расходаў на ўтрыманне польскіх бежанцаў румынскі ўрад канфіскаваў польскае золата, знаходзячаеся ў Бухарэсце. Як вядома, частка польскага золата была нядаўна вывезена ў Англію.

—:::—

Ад'езд часткі польскіх бежанцаў у Англію

БЕРЛІН, 29 верасня (ТАСС). Бухарэстскі карэспандэнт агенцтва Трансацэан паведамляе, што, па вестках з добра інфармаваных колаў, многія вышэйшыя чыноўнікі былога польскага ўрада і вялікая колькасць іншых польскіх бежанцаў, асабліва тэхнічных спэцыялістаў, выяжджае з Румыніі ў Англію. Палагаюць, што апошнія былі запрошаны працаваць на англійскіх ваенных прадпрыемствах.

—:::—

Паездка Чыано ў Берлін

БЕРЛІН, 30 верасня (ТАСС). Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, па запрашэнню германскага ўрада 30 верасня ў паўдні ў Берлін прыбудзе італьянскі міністр замежных спраў Чыано.

—:::—

Заява турэцкага ўрада

НЬЮ - ЁРК, 1 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва „Асошыетэд Прэсс“, асноўваючыся на даставерныя крыніцы, перадае з Анкары, што турэцкі ўрад заявіў Англіі і Францыі, што турэцкія абавязацельствы аб узаемадапамозе будуць ануліраваны, калі Англія і Францыя будуць ваяваць супроць Савецкага Саюза.

Замежны друк аб узаемаадносінах СССР з Германіяй і Эстоніяй

Германія

БЕРЛІН, 30 верасня. (ТАСС). Усе ранішнія газеты прысвечаны далейшаму паглыбленню і ўмацаванню дружбы паміж Германіяй і СССР. Рэзультаты перагавораў у Маскве знаходзяцца ў цэнтры ўвагі ўсяго германскага друку. Газета «Фелкішэр Беобахтэр» у перадавым артыкуле, даючы ацэнку перагаворам паміж Молатавым і Рыбентропам, піша, што тры дакументы, падпісаныя ў Маскве, маюць вялікае палітычнае значэнне. Кожны бачыць, што Еўропа з сённяшняга дня змяніла свой твар. Самыя багатыя па тэрыторыі і насельніцтву краіны пастанавілі развіваць паміж сабою дружбу. Міма гэтага факта ніхто ў Еўропе не можа прайсці без увагі. З гэтым таксама павінен лічыцца і ўсееўрапэйскі свет. Адзначаючы велізарнае значэнне германа-савецкіх адносін для справы міра, газета піша:

„Няхай народы Францыі і Англіі цяпер рашаюць, ці яны хочуць міра ці вайны? Ці хочуць яны праліць патокі крыві і слёз у інтарэсах абанкроціўшыхся палітыкаў“.

Эстонія

ТАЛІН, 1 кастрычніка, (ТАСС). Эстонскія газеты, асабліва „Уус-Эсці“ і „Рахвалехт“, каменціруюць змест савецка-эстонскага пакта аб узаемадапамозе. Эстонская прэса аднадушна адабрае пакт, які не толькі зыходзіць з мірнага дагавора 1920 г., але і развівае яго.

„У тыя часы, — адзначаюць газеты — Савецкая Расія не была яшчэ сільнай марской дзяржавай. Цяпер яна стала першакласнай марской дзяржавай, але яна не мае незамерзаючых партоў. У новым пакце Эстонія пашла поўнасцю насустрэчу Савецкаму Саюзу, прадаставіўшы яму на тэрыторыі Эстоніі магчымасць дадатковай абароны. Адказваючы адной шведскай газеце, разглядваючы пакт, як нарушэнне самастойнасці дзяржаўнай Эстоніі, „Рахвалехт“ піша: „Тое-же самае гаварылася і перш, калі мы заключалі тартуцкі мір. Аднак у працягу дваццаці гадоў мы жылі з СССР у добрасуседскіх адносінах“.

„Уус-Эсці“ так ацэнівае асаблівасці падпісанага пакта: „Абавязацельства аб узаемадапамозе абаюдна, але фактычна Савецкі Саюз будзе падтрымліваць Эстонію кожны раз калі на нас хто нападзе. Мы не памагаем Савецкаму Саюзу толькі тады, калі нападзенне на яго здзейсніцца праз Эстонію ці ў беспасрэднай блізасці да Эстоніі. Інакш кажучы, ваеннае супрацоўніцтва паміж Эстоніяй і Савецкім Саюзам прадбачыцца тады, калі бяспечнасці абедзьвух дзяржаў пагражае небяспека адначасна. Няма сумнення ў тым, што Савецкі Саюз мае большыя абавязацельствы чым Эстонія, таму, што ён павінен прыхадзіць на дапамогу ва ўсіх выпадках, калі на Эстонію будзе адбывацца нападзенне,

Пакт прадбачыць узаемадапамогу ў трох выпадках калі нападзенне або пагроза нападзення накіравана: 1) супроць Эстоніі ці Савецкага Саюза ў Балтыйскім моры, 2) на сухапутныя граніцы Эстоніі ці Савецкага Саюза праз Латвію і 3) на знаходзячыяся ў Эстоніі базы Савецкага Союза. Фактычна ўзаемадапамога будзе аказвацца тады, калі ворагі нападуць на Фінскую Затоку з мора ці сушы, праз Латвію ці Эстонію. Такім чынам. эстонская дапамога Савецкаму Саюзу падразумяваецца, як самаабарона“.

Пакт ня ўносіць ніякіх непаразуменяў ва ўзаемаадносінах Эстоніі з Латвіяй. „Рахванехт“ падкрэслівае прыяцельскія адносіны з СССР: „Так напрыклад выбар базы ў Паялыскі быў зроблены па жаданню самай Эстоніі. Гэты дагавор супрацоўніцтва развязаў такія пытанні, якія ў іншых выпадках даводзілі да крававых сутычак.“

Што-ж яшчэ больш можа падняць прэсціж вялікай Савецкай дзяржавы, як не такія магчымасці супрацоўніцтва з невялікай дзяржавай? Лепшы прыклад устанаўлення мірнага супрацоўніцтва ці можна сабе прадставіць?

Кітай

Шанхай 30 верасня (ТАСС). Сёння шанхайскія газеты на першых старонках апублікавалі паведамленне ТАСС аб падпісанні дагавора дружбы паміж СССР і Германіяй і савецка-эстонскага пакта аб узаемадапамозе. Каменціруючы гэтыя дакуманты газета „Шуньбао“ піша: „Заключэннем пакта аб узаемагапамозе з Эстоніяй Савецкі Саюз развеяў хмары вайны, навісшыя над Еўропай. Важная роль, якую СССР адыгрывае ў еўрапейскай сітуацы, з'яўляецца вынікам аграмадных высілкаў, зробленых кіраўнікамі краіны за апошнія дзесяць гадоў. Мы верым, што Савецкі Саюз даб'ецца яшчэ большых паспехаў у папярэджанні вайны ў Еўропе.

Чунцын, 1 Кастрычніка (Тасс). Газета „Дагунбао“ у артыкуле, прысвечаным падпісанню дагавора аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй, піша: „Масква з'яўляецца важным палітычным цэнтрам Еўропы. Падпісанне дагавора аб узаемадапамозе азначае, што Савецкі Саюз будзе бараніць Эстонію“.

Газета „Сіньхажыбао“ піша: „Падпісанне дагавора аб узаемадапамозе азначае, што СССР будзе цвёрда абараняць мір у Прыбалтыцы. Гэта з'яўляецца чарговым велізарным поспехам палітыкі міра Савецкага Саюза.

—:::—

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

(Па паведамленням ТАСС з Чунцына, Шанхая і Лондана)

У Цэнтральным Кітаі

На фронце ў паўночнай часці правінцыі Хунань прадаўжаюцца баі. 28 верасня японскі атрад у 1000 чалавек пачаў наступаць у паўднёвым напрамку з Байшул (чыгуначная станцыя ў 58 клм. паўночней Чанша). 29 верасня 2 калоны японскіх войскаў, фарсіраваўшых раку Мішуй, пачалі прасоўвацца ў паўднёвым напрамку ад Міло. Кітайскія войскі аказваюць японцам упорнае супраціўленне.

У раёне Інзяня на паўднёва-ўсходнім пабярэжжы возера Дунцінху, за апошнія два дні адбываліся баі з высадзіўшыміся тут японскімі дэсантамі.

Прадаўжаюцца баі на захад ад Фынсіня (правінцыя Цзянсі). Аднавіліся баі паўднёвей Наньчана.

У Паўднёвым Кітаі

Паўднёвей Кантона адбываюцца баі ў раёне Цзянмыня. Асобныя пункты ў гэтым сектары пераходзяць з рук у рукі.

У Паўночным Кітаі

Вестак аб палажэнні на фронце ў паўночным Кітаі не паступала.

—:::—

Паводка ў Кітаі

Як перадаюць з Чунціна паводка ў раёне Тяньцзіня (Паўночны Кітай) прыняла небывалыя размеры. Каля палавіны тэрыторыі англійскай, французскай і японскай канцэсіі знаходзіцца пад вадой. У рэзультаце паводкі ў Бэйпіне, Тяньцзіне і Цындао ўспыхнула эпідэмія халеры. У адным Цындао (Правінцыя Шаньдун) 24 верасня адзначана 45 захворванняў халерай.

* * *

У рэзультаце вялікай паводкі, выкліканай моцнымі дажджамі, ў раёне Куньміна (Паўднёвы Кітай) засталося без прытулку звыш двухсот тысяч чалавек насельніцтва. Куньмін і ваколічныя вёскі знаходзяцца пад пагрозай затаплення. (ТАСС)

Французскае камюніке аб ваенных дзеяннях

ПАРЫЖ, 29 верасня, (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае вячэрняе камюніке ад 28 верасня, у якім гаворыцца:

„Мясцовая атака нашых войск у раёне к усходу ад Мозэля разгарнулась спрыяюча, маюцца палонныя“.

—:::—

Ваенныя дзеянні на заходнім фронце

БРУСЭЛЬ, 29 верасня (ТАСС). Бельгійскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе з Люксембурга, што 27-га верасня ў 16 гадз. пачалась моцная артылерыйская стральба за Мозэлем у раёне Перль, Беш і Борг. 28 верасня з 14 гадзін вельмі моцная кананада чутна была ў Люксембургу.

—:::—

Паведамленне англійскага міністэрста інфармацыі

ЛОНДАН. 30 верасня (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне англійскага міністэрства інфармацыі аб тым, што англійскія самалёты 29 верасня бамбілі караблі германскага ваенна-марскога флота знаходзячагася ў бухце на востраве Гельголанд. Англійскія самалёты падвергліся моцнаму абстрэлу з боку германскай зенітнай артылерыі, некаторыя з іх яшчэ не вярнуліся на базу.

* * *

ЛОНДОН, 1 кастрычніка (ТАСС) Агенцтва Рэйтер перадае па радыё, што, згодна з паведамленнем міністэрства інфармацыі, англійскія самалёты ізноў рабілі дзённыя і начныя палёты над Германіяй.

Нашы самалёты, — гаворыцца ў паведамленні, — утвараючы разведку на заходнім фронце, былі атакаваны непрыяцельскімі самалётамі над тэрыторыяй Германіі. Паветраны бой адбыўся на вялікай вышыні. Нашы самалёты паняслі некаторыя страты. Страты праціўніка невядомы.

—:::—

Заява амэрыканскага журналіста

НЬЮ - ЁРК, 1 кастрычніка. (ТАСС). Вядомы амэрыканскі журналіст Пірсон піша, што на заходнім фронце ёсць усяго 15 тысяч англійскіх салдат, знаходзячыхся галоўным чынам у матарызаваных і авіяцыйных часцях.

—:::—

Водгукі пражскага друку аб савецка-германскім дагаворы дружбы

ПРАГА, 30 верасня (Тасс). Уся пражская прэса змяшчае матэр'ялы аб савецка-германскіх перагаворах у Маскве. Многа якія газеты пасвячаюць гэтаму пытанню вялікія артыкулы. Газета „Народні палітыка“ ў артыкуле азагалоўленам „Нямецкі і рускі народы“ піша, што Расія і Германія ўступілі на шлях супрацоўніцтва ў інтарэсах міра. Калі заходня-еўрапейскія дзяржавы захочуць уста навіць мір, то шляхі да гэтага адкрыты. Калі-ж яны прадоўжаць вайну, то свет будзе сапхнуты ў новую страшную катастрофу.

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Адрас рэдакцыі і друкарні: вул. Епіскопа Бандурскага 4. Тэл. 79 і 99.